ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРАПАГАНДА

Гарадзенскія “беларусцы”: знаёмыя ўсё твары!

Date: 25 Май 2023



Галоўны дзяржаўны інфармацыйны орган вобласці – “Гарадзенская праўда” – паведаміў, што ў Гародні 24 траўня прайшла ўстаноўчая канферэнцыя Кастрычніцкага раённага аддзялення дзяжаўнай партыі “Белая Русь”.

Быў абраны раённы савет аддзялення, у які ўвайшло 11 чалавек.

“Участие в мероприятии приняли заместитель председателя горисполкома, член Высшего политического совета Белорусской партии «Белая Русь» Зоя Кулеша, глава администрации Октябрьского района города Гродно Олег Белинский, заместитель начальника управления идеологической работы и по делам молодежи облисполкома, председатель областной организации «БСЖ» Ирина Степаненко”.

Старшынём раённага савету абраны **Уладзімір Хлябіч**.

Як бачна з пераліку асобаў, стварэннем структураў “Белай Русі”, якая ўсё больш нагадвае старую КПСС, займаюцца выключна праверaныя гадамі і нават дзесяцігоддзямі “кадры”, якія “решают всё”. Так **Алег Бялінскі** працяглы час займаўся фармаваннем выбарчых камісій, якія цэлы час забяспечвалі патрэбныя вынікі. А **Уладзімір Хлябіч** шматразова ўзначальваў тэрытарыяльна-выбарчую камісію. Цяпер ён стаў яшчэ і прызначаным партыйным наменклатурнікам. Менавіта пра выбары і гаварыў Хлябіч:

“Поле для работы огромное: консолидация белорусского общества в такое непростое время, разъяснение государственной политики и другие важные для нашей страны вопросы, которые надо решать. Впереди и Единый день голосования. У нас есть время подготовиться к этому событию, чтобы достойно войти в эту электоральную кампанию и своими кандидатами в депутаты, и участием в избирательных комиссиях”.



АЛЕГ БЯЛІНСКІ **БЕЛАЯ РУСЬ** **ГАРОДНЯ** **УЛАДЗІМІР ХЛЯБІЧ** **ІДЭАЛОГІЯ**

© 2023 ГАРАДЗЕНСКАЯ ПРАВААБАРОНА

BLOG AT WORDPRESS.COM.